ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА

17 мая 2014 года

# Найлепшы араты вучыцца ў БДАТУ




**Гэта пацвярджаюць вынікі Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства "Найлепшы араты". Ініцыятарам правядзення конкурсу сярод студэнтаў і майстроў вытворчага навучання ўстаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі восьмы год выступіў БДАТУ. Удзел у конкурсе прынялі 12 каманд двух флагманаў вышэйшай сельскагаспадарчай адукацыі рэспублікі — БДАТУ і БДСГА.**

На першым этапе спаборніцтваў канкурсантам неабходна было паказаць тэарэтычныя веды ў галіне падрыхтоўкі да работы і эксплуатацыі машынна-трактарнага агрэгата. І тут у лідарах аказалася каманда БДАТУ. Але наперадзе ўдзельнікаў чакалі яшчэ два этапы конкурсу. Найлепшы араты 2014 года павінен быў вызначыцца на адным з сельгасугоддзяў эксперыментальнай базы імя Катоўскага, падшэфнай гаспадаркі БДАТУ ва Уздзенскім раёне.

Канкурсантаў чакалі трактары з плугамі і размечаныя ўчасткі, на якіх трэба было прадэманстраваць сваё майстэрства ўзворвання глебы. Дзень асноўных спаборніцтваў быў як на заказ. Асляпляльна блакітнае неба, яркае вясенняе сонца, невялікія воблакі. Такое надвор'е настройвала на пазітыў, стварала адпаведны настрой і стымулявала ўдзельнікаў спаборніцтваў і судзейскую брыгаду да актыўных дзеянняў.

Па ўмовах конкурсу, спаборнічаць павінны былі не толькі студэнты, але і майстры вытворчага навучання, якія знаходзіліся ў складзе каманд. Адпаведна, спаборніцтвы павінны былі праходзіць у дзвюх катэгорыях — "А" і "В". Перад стартам саpraнікі маглі азнаёміцца з участкамі зямлі, на якіх ім трэба было паказаць майстэрства ва ўменні працаваць з плугам, а таксама ўдакладніць усе тэхналагічныя тонкасці і нюансы працэсу спаборніцтва.

Перамога залежала ад якасці ўзворвання, якая вызначалася такімі крытэрыямі, як рух агрэгата з аптымальнай хуткасцю, прамалінейнасць баразны, глыбіня ўзворвання, задзел раслінных рэштказ. Вельмі важна было прафесійна зрабіць першы падыход, бо ён і вызначае будучы вынік. Важны і рэжым хуткасці. Калі хуткасць будзе ніжэй, чым патрабуецца, не адбудзецца поўнага абароту скібы, калі ж занадта высокай, скіба будзе "ляцець". Глыбіня ўзворвання — таксама важны складнік поспеху. Яна павінна быць ад 18 да 22 сантыметраў. Адыгрывае ролю і структура глебы, і яе вільготнасць, таму трактарысту ў працэсе ўзворвання неабходны і вопыт, і веды, і чуццё.

Гул матораў абвясціў пачатак спаборніцтваў. У працэс адзін за адным пачалі ўключацца ўдзельнікі. Спачатку прэтэндэнту на званне найлепшага аратага неабходна было паказаць веды ў тэхнічным абслугоўванні машыны, яе настройцы на работу, паслядоўнасць і правільнасць дзеянняў, якія патрабуюцца перад выхадам у поле. Затым стартавая лінія, плуг у зямлю — і тут ужо максімальная сканцэнтраванасць і поўнае выкладванне. У выніку ўсе навыкі, вопыт і майстэрства трактарыста пакажа глеба, якасць узворвання якой судзейская брыгада ацэніць з дапамогай вымяральных інструментаў. Максімальную аб'ектыўнасць забяспечвае методыка вызначэння наймацнейшага: выносячы вердыкт, суддзі не ведаюць імён тых, чый вынік яны ацэньваюць.

Нарэшце апошні канкурсант завяршае сваю баразну. Цяпер у работу ўключаецца журы. На невялікім кавалку поля, акружанага маляўнічымі вясковымі пейзажамі, дзе сабралася судзейская брыгада, ідзе інтэнсіўны працэс апрацоўкі інфармацыі. І вось названы імёны пераможцаў.

Найлепшым аратым сярод навучэнскай моладзі стаў студэнт 4 курса аграмеханічнага факультэта БДАТУ Іван Бункевіч. Удастоіцца такога звання ў яго былі ўсе перадумовы. Ён патомны хлебароб і ўпэўнена ідзе па слядах сваіх бацькоў.

— Нарадзіўся ў вёсцы Турын Пухавіцкага раёна, — гаворыць Іван, — і не па чутках ведаю, што такое зямля і праца на ёй. Як і ўсе сялянскія дзеці, часта бегаў да бацькоў "на работу", паглядзець, чым яны займаюцца. Так што ўсе нюансы вясковага жыцця мне знаёмы, як і сельскагаспадарчая вытворчасць, дзе мне прыйдзецца працаваць пасля заканчэння ўніверсітэта.

Лідарам сярод майстроў вытворчага навучання таксама стаў прадстаўнік БДАТУ Васіль Пшэнік. На трактары "МТЗ-1523" з пяцікорпуснымі абarotнымі плугамі ён аказаўся самым моцным прафесіяналам у больш складанай катэгорыі спаборніцтваў — "В". Такім чынам, на найвышэйшай прыступцы п'едэстала конкурсу прафесійнага майстэрства "Найлепшы араты — 2014" аказалася каманда БДАТУ. Яна яшчэ раз пацвердзіла высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі як студэнтаў універсітэта, так і тых, хто перадае ім неабходныя веды і ўласны вопыт.

Назавём і тых, хто ў нялёгкай барацьбе за званне найлепшага заняў другую і трэцюю пазіцыі. Сярод студэнтаў гэта Яўген Бурбуць з БДСГА і Дзмітрый Саль, навучэнец Жыровіцкага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа. Сярод майстроў вытворчага навучання — Аляксей Залатухін з Мар'інагорскага ДАТК і Яўген Бякрэнь з Жыровіцкага ДАТК. У камандным заліку другое месца занялі прадстаўнікі Жыровіцкага ДАТК і трэцяе — Пружанскага ДАТК.

**Аляксандр ДЫНІКАЎ.**